АБ УСІМ, ШТО БАЛІЦЬ

№ 32/39/—6.УШ.1976
МІНСК

ТОЛЬКІ ГУТАРКА ХОДЗІЦЬ ТАКАЯ...
Я.КУПАЛА

# ГУТАРКА

## САМАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ

Калі паслухаць нашых непрыяцеляў і заплюшчыць вочы на жыццё, то можна падумаць,што ўжо ніякай Беларусі няма, што ніхто з беларусаў не лічыць сябе беларусам і ніхто з іх не прызнае беларускую мову за сваю родную і не гаворыць на ёй. Памятаю, як адзін з такіх варожых тыпаў так і заявіў: "Калі правесці апытанне, то ніхто не назаве сябе беларусам, і ўсе скажуць, што беларуская мова непатрэбная".

І вось гэта ўсенароднае апытанне прайшло ўжо двойчы. Ім з'явіліся перапісы насельніцтва у 1959 і 1970 гг., якія з усёй відавочнасцю развеялі хлуслівыя сцверджанні аб дэнацыяналізацыі Беларусі. Больш таго, яны з неабвержанай грунтоўнасцю паказалі, што Беларусь — самая нацыянальная рэспубліка, а беларускі народ — адна з самых жыццядольных нацый.

Нягледзячы на тое, што наша тэрыторыя не мае прыродных межаў і таму на працягу ўсёй нашай гісторыі падупадала розным нашэсцям і звязаным з імі перамяшчэннем і перамешваннем насельніцтва, беларусы жывуць кампактнай масай і складаюць 81 % усяго насельніцтва Беларусі. Калі ж сюды дадаць тых беларусаў-каталікоў, якія па старой традыцыі называюць сябе палякамі, але лічаць сваёй роднай мовай беларускую, то беларусы, як самае малое, складаюць 85 % насельніцтва сваёй рэспублікі і у гэтых адносінах уступаюць толькі армянам (89 %).

Перапісы пацвярджаюць і высокую нацыянальную свядомасць беларусаў. Яны адрозніваюць сябе не толькі ад палякаў, украінцаў, літоўцаў, але і ад велікарусаў і не толькі на сваёй тэрыторыі, але і па-за яе межамі. Так, 845 тыс. чалавек у РСФСР назвалі сябе беларусамі.

Нічога не маюць агульнага з сапраўднасцю і сцверджанні аб нібыта пагалоўным вырачэння беларусамі сваёй роднай мовы. Нягледзячы на шматвяковую работу нашых ворагаў па выкарчоўванню і апляванню беларускай мовы, 9% беларусаў, якія жывуць у Беларусі, прызнаюць сваёй роднай мовай беларускую. Звыш паловы жжжх тых беларусаў, што жывуць па-за межамі сваёй зямлі, таксама не выракаюцца роднай мовы. Апроч таго, 275 тыс. чалавек іншых нацыянальнасцяў у Беларусі таксама прызнаюць сваёй роднай мовай беларускую.

Такім чынам, вынікі перапісаў вельмі добра паказваюць, што размовы пра адміранне Беларусі і ўсяго беларускага — ніжто іншае, як імкненне прыняць жаданне за наяўнае, як старанне зжыва пахаваць Беларусь.